НАШЫ ЗЕМЛЯКІ

# Якуб Брайцаў

У сялянскай сям'і ў в. Забалышыне былога Клімавіцкага павета Магілёўскай губерні 19 лютага 1861 года нарадзіўся Якуб Раманавіч Брайцаў. Яго бацькі з усіх сіл стараліся, каб як найлепш выхаваць сына, даць яму адукацыю. У роднай вёсцы хлопчык Якуб скончыў пачатковую школу. Пасля вучыўся ў Клімавіцкім павятовым вучылішчы.

Некаторы час пасля вучобы ён працуе памочнікам пісара Забалышынскага валаснога ўпраўлення, а неўзабаве канторшчыкам цукровага завода на Украіне ў памешчыка Цярэшчанкі.

Калі Якубу споўнілася 20 год, ён едзе шукаць шчасця ў Маскву. У канторы вядомага ў той час купца-кветкавода Ф. Пэка ён хутка атрымаў пасаду бухгалтара. Адначасова Я. Брайцаў вывучае мастацкую літаратуру, часта наведвае Румянцаўскую бібліятэку і піша аповесць «Багачы».

У аповесцях «Няўдашачка Анюта» (1887), «Старая вёска» і іншых расказваецца пра быт і тыпы Клімаўшчыны.

У далейшым Я. Брайцаў бярэцца за адвакацкую працу, адначасова вывучае кветкаводства і нават адкрывае ў Маскве магазін па продажу кветак. Але на гандлёвай справе ён хутка прагарэў, страціў усе матэрыяльныя сродкі, якія збіраў з вялікімі цяжкасцямі. Зборнік яго апавяданняў, які ўжо быў набран у друкарні, праз гэта так і не ўбачыў свету.

Пасля 20-гадовага пражывання ў Маскве Я. Брайцаў зноў вяртаецца ў родныя мясціны, бярэцца за сельскую гаспадарку, а пасля за адвакацкую працу па сялянскіх справах. У гэтыя ж часы ім была напісана камедыя «Бяда цыгана», у якой расказваецца пра падзеі ў Беларусі.

Пра жыццё беларускай вёскі і мястэчак у перыяд першай рускай рэвалюцыі напісан пісьменнікам вялікі раман «Сярод балот і лясоў».

Пасля Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі Я. Брайцаў працуе ў павятовым Клімавіцкім выканкоме, у дваццатых гадах быў членам калегіі аддзела сацыяльнай абароны, а пасля членам калегіі зямельнага аддзела. У 1925—1927 г.г. ён працаваў выкладчыкам у Забалышынскай школе сялянскай моладзі.

Якуб Раманавіч у гэты час не пакідае і літаратурную працу, піша артыкулы ў «Крестьянскую газету», напісаў аповесць «Гаспадар» і шэраг вершаў. Ён быў членам Усерасійскага Саюза сялянскіх пісьменнікаў.

Памёр пісьменнік 2 сакавіка 1931 г. у Забалышынскай бальніцы і пахаваны на мясцовых могілках.

С. Койданаўскі.

**Койданаўскі, С.** Якуб Брайцаў : нашы землякі / С. Койданаўскі // Якуб Брайцаў [Папка газетных выразак]. — (Забялышынская СБ).